УДК 821.161.3.09

# ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНАЕ СВЕТААДЧУВАННЕ ГЕРОЯЎ РАМАНА ІВАНА МЕЛЕЖА "ЛЮДЗІ НА БАЛОЦЕ"

**Т.М. Тарасава**
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка*
*Мінск, Беларусь, tamaratarasava@gmail.com*

У артыкуле разглядаюцца праблемы калектывізацыі праз прызму экзістэнцыяльнага светаадчування герояў рамана Івана Мележа «Людзі на балоце». Побытавы пласт твора выяўляе экзістэнцыяльную сутнасць чалавека на канкрэтным гістарычным адрэзку часу, маштабы філасофскіх праблем жыцця, яго анталагічнай сутнасці. У лёсе кожнага героя рамана «Людзі на балоце» ляжыць аўтарская ідэя адзінкавасці, непаўторнасці, самакаштоўнасці кожнай жыццёвай сітуацыі.

*Ключавыя словы*: Іван Мележ; раман «Людзі на балоце»; экзістэнцыя; экзістэнцыяльнае светаадчуванне.

Асэнсаванне праблем калектывізацыі беларускай вёскі ў нацыянальнай прозе даўняе і глыбокае: «Адшчапенец» Якуба Коласа; «Саўка-агіцірнік» М. Лынькова; «Чорная Вірня» Б. Мікуліча; «Лявон Бушмар» Кузьмы Чорнага і інш. Дадзеная тэма агаліла жорсткія контуры ўнутрана несвабоднай асобы, калі чалавек павінен быў дзейнічаць не зыходзячы з патрэб сваёй душы, а адпаведна з ускладзенай на яго грамадствам роляй. Так, Сымон Карызна («Вязьмо») М. Зарэцкага дзейнічае пад уплывам тых абставін, у якіх герой апынуўся. Лёс Башлыкова з «Палескай хронікі» І. Мележа абумоўлены імкненнем партыйнага кіраўніка рухацца па службовай лесвіцы. Фактычна ўсе героі-калектывізатары вымушаны падаўляць у сабе прыродныя якасці і дзейнічаць у адпаведнасці з якасцямі, адштампаванымі новымі абставінамі. Таму рэчаіснасць, якую яны ствараюць, пазбаўлена рэальнай жыццёвай сілы, бо згублены самыя простыя паняцці дабра і зла. Невыпадкова Хведар Роўба з аповесці «Аблава» В. Быкава, вярнуўшыся дадому, знаходзіць у вёсцы запусценне і галечу. Закасцянелая, нерухомая рэчаіснасць, якую прадстаўляе Якуб Колас у аповесці «Адшчапенец», пазбаўляе чалавека магчымасці самарэалізавацца, і, нягледзячы на вонкавую аптымістычную канцоўку твора, селянін Пракоп Дубяга прадчувае трагічную неадпаведнасць свайго лёсу новай рэчаіснасці. Герой Коласа – асоба, якая не спяшаецца рэалізавацца ў новым жыцці: аналітычны розум селяніна, яго стойкая пазіцыя недалучанасці даюць герою права сумнявацца і вагацца. Селянін-працаўнік інтуітыўна адчуваў, што нешта падрывае тагачаснае жыццё знутры, што стабільнасці не будзе і супакойвацца рана. Тэндэнцыі літаратуры 1930-х гг. пра калектывізацыю будуць працягнуты новым пакаленнем пісьменнікаў, сярод іх у першую чаргу назавем Івана Мележа (1921–1976).

Трагізмам напоўнены лёсы мележаўскіх сялян з вёскі Курані. Прастора Куранёў – прастора анталагічная, невыпадкова людзі супраціўляюцца будаўніцтву грэблі; яны самадастатковыя, экзістэнцыяльна паўнавартасныя. Многія беды прыйдуць у вёску менавіта пасля пабудовы грэблі з вялікага свету і разбураць гэтую першааснову. Адарванасць Куранёў вадой, балотам ад свету стварае эфект быць «па-за часам, па-за прасторай». Нягледзячы на пэўную прывязанасць падзей да канкрэтнай гістарычнай эпохі, канкрэтных бытавых рэалій, героі І. Мележа пасля рэвалюцыі знаходзяцца ў нявызначаным стане: іх вырвалі са звыклай прасторы, а ў новую яны не ўвайшлі; няма звароту назад, а рух уперад страшны. Фактычна людзі апынуліся паміж эпохамі і пазбаўлены ўсялякай жыццёвай апоры. Не маюць яе і сяляне, і кіраўнікі (напрыклад, Апейка таксама разгублены, яго лёс трагічны). Сёння правамерна гаварыць пра агульны трагізм «Палескай хронікі» І. Мележа: вялікія ідэі не прымаюць пад увагу жыццё радавога чалавека. Ідэя новай улады пабудаваць грамадства суцэльнай роўнасці і дастатку загадзя была асуджана на правал, бо першапачаткова ігнаравалася экзістэнцыя чалавека.

Мележаўскі герой адначасова жыве і ў бытавой, і ў анталагічнай прасторы. Магутны бытавы пласт выяўляе экзістэнцыяльную сутнасць чалавека на канкрэтным гістарычным адрэзку часу. Сацыяльныя інстытуты гэтай эпохі толькі ўскладняюць яго жыццё, але ў гэтым і ёсць гістарычная наканаванасць. Сіла таленту І. Мележа заключаецца ў тым, што пісьменнік канкрэтна-гістарычнае жыццё чалавека далучыў да філасофскай праблемы жыцця наогул, яго анталагічнай сутнасці. І ў маштабах філасофскіх ураўнаваны і сяляне, і кіраўнікі, і заможныя, і бедныя.

Дзеючыя асобы рамана «Людзі на балоце» самадастатковыя, узаемападобныя і розныя адначасова. Гэтыя людзі ў пераважнай большасці сваёй заземленыя на сваім побыце, штодзённым клопаце, часам манатонным, можа нават нудным/не цікавым, але гэтая заземленасць герояў не адштурхоўвае чытача, няўлоўны аўтарскі экзістэнцыяльны падтэкст фарміруе ў творы глыбінную філасофскую канцэпцыю, якая ўздзейнічае не толькі вобразам, але і рытмічнай арганізацыяй фразы, рознаракурснымі сцэнамі, паўторамі. Звернем увагу на пачатак рамана: *«Хаты былі на востраве. Востраў гэты, праўда, не кожны прызнаў бы за востраў - аб яго не плёскаліся ні марскія, ні нават азёрныя хвалі. Навокал адно гніла куп'істая дрыгва ды моклі панурыя лясы. <...> Але такое становішча тут не палохала, людзям на востраве яно здавалася зусім звычайным. З усіх бакоў, блізка і далёка, ведалі яны, - такія ж самыя выспы сярод бясконцых багнаў, дзікіх зараснікаў, што разлегліся на сотні вёрст з поўначы на поўдзень і з захаду на ўсход. Людзям тут трэба было жыць, і яны жылі. Аднастайныя, нудныя дажджы, што месяцамі лілі на мокрыя стрэхі, сцюдзёныя вятры, што люта білі ў замерзлыя вочкі-шыбы завеямі, цёплае сонца, што ўставала ў пагодныя дні над купамі алешніку, - усё бачыла гэты востраў заклапочаным, у няспыннай, штодзённай руплівасці. Людзі заўсёды чым-небудзь былі заняты: уранку і ўвечары, летам і зімою, у хаце, на двары, у полі, на балоце, у лесе...»* [1, с.7]. Такі аўтарскі зачын фарміруе бясконцую перспектыву свету, бязмежную прастору жыцця наогул.

І. Мележа цікавіць логіка жыцця палешукоў, старых і малых, слабых і дужых, працавітых і гультаяватых, логіка чалавечай псіхікі, пададзеная праз адначасовасць розных поглядаў на свет, няўлоўныя адценні думак герояў, выказаных і нявыказаных імі слоў. Нават Васіль і Ганна ў сваім каханні не заўсёды здольныя спасцігнуць «другога», заглыбіцца ў прыроднае быццё другой палавіны, і гэта становіцца бясконцым стрэсам для герояў. Невыпадкова раман «Людзі на балоце» заканчваецца на трагічна ноце: *«- Ты б от Ганну лепей трымаў пры сабе! - зачапіў Хоня. - Такую дзеўку ўпусціў.*

*- Упусціў не ўпусціў - што з таго! Чаго мне було дзяржаць яе!..*

*- Як ето - чаго?*

*- А так - сам голы!.. Ды шчэ голую браць на шыю!..*

*- Ета, не сакрэт, на шыі не була б! - сказаў Міканор. - От дзеўка - што ўродаю, што рукамі, першая мо на ўсю воласць! Мяне аж зайздрасць брала, што яна з табою! Упусціў!*

*- Упусціў! - Васіль раптам ускіпеў. - Ну, упусціў! Што вам!*

*Міканор сумеўся: упершыню чуў такі сум, такі боль у гэтым маўклівым, недаверлівым хлопцу. Каб суцешыць, супакоіць трохі Васіля, сказаў вінавата:*

*- Нічога, можа, шчэ і не ўсё кончылася! У жыцці, не сакрэт, усяляк бувае...*

*Васіль не адказаў»* [1, с. 396].

Прычына канфлікту паміж Васілём і Ганнай і ў пэўнай мужчынскай нерашучасць, і ў прыроднай сціпласці Васіля, яго залішняй маўклівасці. Замкнёнасць герояў у абалонцы сваёй індывідуальнасці пазбаўляе іх магчымасці быць шчаслівымі. Безумоўна, сапраўдныя першапрычыны ўчынкаў герояў схаваны за знешняй падзейнасцю, бо глыбінны сэнс – у падтэксце, ключ да якога ў таямніцах жыцця, у загадкавасці, супярэчнасцях чалавечай душы.

Прыгадаем роздум Ганны ў першую ноч замужжа: *«У тую ноч, першую ноч замужжа, Ганна доўга не магла заснуць. <...> Ляжала ў душнай цемры, здавалася, забытая ўсімі, пакінутая, адна-адзінокая ў цэлым свеце.*

*“От і ўсё”, - як бы прарываючыся праз туман, думала яна з такою тугою, нібы настаў канец свету. “Усё, усё, усё”, - гаварылі, паўтаралі ёй бясконца ходзікі на сцяне. “Што - усё?” - губляла, намагалася яна зноў злавіць сэнс гэтага “ўсё” і часта не магла знайсці, вярнуць хоць якую яснасць галаве, якая поўнілася непадатным, нядобрым туманам.*

*“Усё адно. Рано ці позна... Ніхто не мінае... Прывыкну як-небудзь... Усе прывыкаюць, і я - таксамо...” - прадзіраліся часам у галаве важкія, цягучыя думкі, потым зноў усё прападала ў тумане і атупеласці»* [1, с. 392-393].

І. Мележ тонка перадае пульс, рытм, дынаміку тагачаснага жыцця, яго крохкасць і разарванасць. Усе персанажы без выключэння пастаўлены ў сітуацыю выпрабавання – выпрабавання дабром і злом, верай і вернасцю, здрадай і каханнем. Выбар старога Глушака цалкам адпавядае яго светаразуменню – абараніць сваё крэўнае, нажытае. Халімон Глушак, «*маленькі, сухенькі, такі дробны ў параўнанні са сваёй шырокай, самай вялікай у Куранях будынінай*» [1, с. 84], глядзеў на свет «*вострым позіркам тхарыных вачэй*», «*нічога важнага нікому не давяраў, сынам нават, рабіў сам*» [1, с. 84]. Стары селянін імкнецца прымірыць пачуццё абсурднасці ад несправядлівасці жыцця і неабходнасць жыць. Увогуле ракурс паказу сям’і Глушакоў у рамане ёсць свядомая ўстаноўка пісьменніка на псіхалагічны экперымент, скіраваны на пашыранае даследаванне сферы экзістэнцыяльнага быцця, чалавечай індывідуальнасці ў поліфаніі грамадскіх сувязяў у межах Куранёў.

У лёсе кожнага героя рамана «Людзі на балоце» ляжыць аўтарская ідэя адзінкавасці, непаўторнасці, самакаштоўнасці кожнай жыццёвай сітуацыі. Такі падыход дыктуе адпаведны прынцып адбору матэрыялу, каб самым падрабязным чынам апісаць факты, іх адценні і – самае важнае – «*дакладна вызначыць маштаб і характар гэтай перамены*» [2]. Для І. Мележа 1960-1970 гг. важна было зафіксаваць па магчымасці дакладна, цэласна ўнікальнасць асобы і ўнікальнасць часу. Яго персанажы засяроджаны выключна на прыватным жыцці і адчуваюць не столькі моц дзяржавы (яе ў першым рамане і няма, ёсць вёсачка на балотным востраве), колькі прэсінг людзей, што побач, прэсінг уласных комплексаў, матэрыяльных абставін.

Выразная дэталізацыя псіхалогіі пакрыўджанай Яўхімам Хадоські ярка ўвасабляе стан душы гэтай вясковай сяброўкі Ганны Чарнушкі падчас наведвання знахаркі. Свядомасць дзяўчыны фіксуе выпадковыя, хаатычныя, сумбурныя дэталі (глінішчанскія могілкі, хаты, агароды, «*чубы чароту*» на балоце, чорная хатка знахаркі, «*засаўка шарганула*»), але менавіта яны ствараюць атмасферу хуткаплыннасці і завуаляванасці жыцця. Перажытае Хадоськай у доме знахаркі, трагедыя духу дзяўчыны – гэта яе ўласны шлях да пазнання быцця.

Духоўныя пошукі герояў рамана «Людзі на балоце» ды і ўсёй «Палескай хронікі» сведчаць аб важнасці іх жыццёвых праблем і аб цяжкасці альбо немагчымасці ў свеце спакус і грахоў выбіраць правільнае рашэнне, аб пакутніцкіх кроках па жыцці, дзе кожны паасобку выбірае сваю адзіную сцежку.

І. Мележ у межах рэалістычнага праўдападабенства вельмі аб'ёмна выявіў экзістэнцыяльныя параметры свядомасці чалавека, глыбіню яго перажыванняў: татальнае адчужэнне, адзіноту, некамунікабельнасць, расчараванне ў многіх канцэпцыях філасофіі гуманізму, пакутлівы пошук новых каштоўнасных арыенціраў у час змены светапоглядных прыярытэтаў.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ
1. Мележ, І. Людзі на балоце / І. Мележ // Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мн. : Маст. літ., 1981. – Т. 5. – 415 с.
2. Сартр, Ж.-П. Тошнота : [Электронны рэсурс] / Ж.-П. Сартр. – Рэжым доступу: https://www.booksite.ru/localtxt/sar/tr/sartr_j_p/tos/hno/toshnota/1.htm. – Дата доступу: 11.05.2026.

## EXISTENTIAL WORLD-FEELING OF THE HEROES IN THE NOVEL "PEOPLE OF THE MARSH" BY IVAN MELEZH

**T.M. Tarasava**
*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*
*Minsk, Belarus, tamaratarasava@gmail.com*

The article examines the problems of collectivization through the prism of the existential world-feeling of the heroes in the novel "People of the Marsh" by Ivan Melezh. The everyday surroundings in the novel reveal the existential essence of a man in a specific historical period of time, the scale of philosophical problems and ontological essence of life. In the fate of each hero in the novel "People of the Marsh" lies the author's idea of uniqueness and value of every life situation.

*Keywords*: Ivan Melezh; novel "People of the Marsh"; existence; existential world-feeling.